6. Михайлов, О. В. Новая версия индекса Хирша – j-индекс // Вестник Российской академии наук. 2014. Т. 84, № 6. С. 532. DOI: https:// doi.org/10.7868/S0869587314060085
7. Герасименко, П. В. Модификации индекса Хирша для дифференцированной оценки результатов творческой деятельности ученых // Управление наукой и наукометрия. 2020. Т. 15, № 1. С. 55 – 71. DOI: https: //doi.org/10.33873/2686-6706.2020/15-1.55-71

УДК 633.17:631.811.98:658.155

# ШЛЯХ ПРАЦЯГЛАСЦЮ Ў 70 ГАДОЎ

**Г.А. Гесть**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. Паказана гісторыя развіцця УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (сельскагаспадарчы інстытут), у якой паказваецца пачатак дзейнасці ўстановы адукацыі, станаўленне факультэтаў и аддзелаў, магчымыя месцы працы выпускнікоў навучальнай установы. Асобая ўвага звяртаецца на педагагічны каллектыў, які пачынаў працаваць з 1951 года у інстытуце. Значнае месца адводзіцца разгляду ўмоў працы і адпачынку студэнтаў універсітэта. Гэтым самым паказваецца значнасць УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт» у падрыхтоўцы спецыялістаў для аграпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь.
Ключавыя словы: аграрны ўніверсітэт, гісторыя, шлях, факультэты, кафедры, выкладчыкі, студэнты, накірункі дзейнасці, спецыялісты

# ПУТЬ ДЛИНОЮ В 70 ЛЕТ

**Г. А. Гесть**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. Представлена история развития УА «Гродненский государственный аграрный университет» (сельскохозяйственный институт), в которой показано начало деятельности учебного заведения, формирование факультетов и кафедр, возможные места работы выпускников учебного заведения. Особое внимание уделяется профессорско-преподавательскому составу, который начал работать в



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

институте в 1951 году. Большое внимание уделяется условиям труда и отдыха студентов вузов. Это свидетельствует о важности УО «Гродненский государственный аграрный университет» в подготовке специалистов для агропромышленного комплекса Республики Беларусь.
Ключевые слова: аграрный университет, история, путь, факультеты, кафедры, преподаватели, студенты, направления деятельности, специалисты.

## THE WAY DURING 70 YEA RS

**G. A. Gest**
EI «Grodno State Agrarian University» (Republic of Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The history of development of UA "Grodno state agrarian university (agricultural institute) in which the beginning of activity of educational institution, formation of faculties and departments, possible places of work of graduates of educational institution is shown is shown. Particular attention is paid to the teaching staff, which began working in 1951 at the institute. Considerable attention is paid to the working and leisure conditions of university students. This shows the importance of the Grodno State Agrarian University in training specialists for the agro-industrial complex of the Republic of Belarus.
Key words: agrarian university, history, way, faculties, departments, teachers, students, directions of activity, specialists

17 студзеня 1951года І. У. Сталін падпісаў у Крамлі Пастанову Савета Міністраў СССР № 145 «Аб арганізацыі сельскагаспадарчага інстытута ў горадзе Гродна Беларускай ССР». Па загадзе Міністэрства вышэйшай адукацыі інстытут пачаў сваю працу 27 чэрвеня 1951 года. Пад інстытут аддалі будынак былога Гродзенскага абкама партыі па вуліцы Акадэмічнай 10 (цяпер корпус біятэхналагічнага факультэта).

На 1-ы курс агранамічнага и заатэхнічнага факультэтаў было залічана 175 студэнтаў, на 2-і курс - 25. У інстытуце працавалі 24 выкладчыкі, 7 з якіх мелі вучоную ступеню кандыдата навук.

30 чэрвеня 2000 года інстытут быў пераўтвораны ў аграрны універсітэт. З 1995 года універсітэт ўзначальвае яго выпускнік член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Песціс Вітольд Казіміравіч (да яго на гэтай пасадзе працавалі Качура І.М., Арацкаў П.А., Цімашынін У.Д., Ягораў Ю.Г. і Вітун Я.Р.).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

На 30 кафедрах універсітэта працуюць 307 выкладчыкаў, з іх 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, 17 дактароў і 149 кандыдатаў навук. Ва універсітэце навучаецца 1697 студэнтаў на дзённым аддзяленні, і на завочным – 2618 чалавек. Універсітэт мае 6 навучальных карпусоў, 7 інтэрнатаў, бібліятэку, музей, спартыўным клуб, стадыён, базу адпачынку і сталовую.

У ВНУ працуюць выдавецка-паліграфічны аддзел, які выпускае падручнікі, вучэбныя і метадычныя дапаможники, аддзелы па выхаваўчай рабоце з моладдзю (2001 г.) і інфармацыйных тэхналогій (2001 г.) [1, 2].

Мэта работы: паказаць дасягненні УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» за 70 гадоў працы.

Даныя для артыкула выкарыстаны з дакументаў, якія сведчаць аб гісторыі развіцця навучальнай установы, яе факультэтаў, кафедр, а таксама - выкладчыкаў.

Пры правядзенні даследавання карысталіся метадамі аналізу, сінтазу, параўнання, гістарычным.

За 70 гадоў работы выпущана установай адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» больш за 30 тысяч высокадыпламаваных спецыялістаў. Яны добрасумленна працуюць у аграпрамысловым комплексе Беларусі, у навукова-даследчых установах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Адны з іх узначальваюць органы дзяжаўнага кіравання. Звання Героя Сацыялістычнай працы ўдастоены 8 выпускнікоў універсітэта, 3 – з’яўляюцца Героямі Рэспублікі Беларусь (Дубко А.І., Крамко В.І, и Рэвяка В.А); 43-ом - прысуджана ганаровае званне «Заслужаны працаўнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

У 1968 годзе ў раёне вёскі Зарыца адкрыта доследнае поле ўніверсітэта, на якім студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў праходзяць навучальныя практыкі, а таксама праводзяць даследаванні земляробчага і раслінаводчага характару з мэтай напісання дыпломных работ. У 1971 годзе ўведзена пасада прарэктара па навуковай рабоце, а ў 1977 годзе - абавязковая абарона дыпломных работ студэнтамі.

У 1992 годзе ў універсітэце адкрыта аспірантура. Падрыхтоўка аспірантаў праводзіцца па 8, магістраў - па 5, дактарантаў - па 2 спецыяльнасцях.

У цяперашні час для развіцця навукі ў універсітэце створаны ДНК-лабараторыя, біятэхналагічны цэнтр, цэнтр навуковага пчалярства, селекцыйны цэнтр па стварэнні новых гатункаў збожжавых культур, даследчаны сад. Па выніках даследаванняў у апошнія гады адзін

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

выкладчык абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара навук і 22 - кандыдата сельскагаспадарчых навук.

У Рэспубліцы Беларусь працуюць акадэмікамі НАН Беларусі такія былыя выпускнікі універсітэта, як Багдзевіч І.М. і Лапа В.В.; членамі-карэспандэнтамі - Ламан Н.А, Галушка В.М., Скакун А.С.; Песціс В.К., прафесарамі - Каляда К.У., Мілоста Г.М. і Танана Л.А.

У 1997 годзе ў вышэйшай навучальнай установе адкрыты аддзел знешніх сувязяў. Спецыялісты яго арганізуюць з замежнымі краінамі абмен студэнтаў для праходжання навуковых практык, забяспечваюць навучанне ва універсітэце замежных студэнтаў з Туркменістана, Узбекістана, Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі, Індыі, Польшчы і Літвы.

З 2004 года ва ўстанове адукацыі працуе вучэбна-метадычны аддзел. Пад кіраўніцтвам спецыялістаў арганізуецца на дагаварных пачатках навукова-даследчая работа выкладчыкаў на базах прадпрыемстваў АПК. Таксама пры яго садзейнічанні выдадзена выкладчыкамі за апошнія пяць гадоў каля 30 кніг, дапаможнікаў і метадычнай літаратуры.

За мінулыя гады на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападгатоўкі кадраў прайшлі перападрыхтоўку больш за 44 тысячы спецыялістаў аграпрамысловага комплексу.

Ў 1962 годзе створаны факультэт абароны раслін (пачынаў працу ў якасці дэкан к.с.-г.н., дацэнт Северцаў М.С.). На факультэце працуюць цяпер тры кафедры: фітапаталогіі и хімічнай абароны раслін; энтамалогіі і біялагічнай абароны раслін, аграхіміі, глебазнаўства и сельскагаспадарчай экалогіі.

З 1998 года пачаў працаваць эканамічны факультэт (дэканам назначаны к.э.н., дацэнт Дзегцярэвіч І.І.). Тут створаны кафедры эканомікі АПК; арганизацыі вытворчасці ў АПК; мэнэджмэнту, маркецінгу и права; тэорыі эканомікі; інфарматыкі і эканоміка-матэматычнага мадэлявання.

З 2002 года быў адкрыты факультэт ветэрынарнай медыцыны (дэканам назначаны к.в.н., дацэнт Каўрус М.А.). У лік кафедр увайшлі: гігіены жывел; фармакалогіі і фізіялогіі; анатоміі жывел; акушэрства і тэрапіі; мікрабіялогіі і эпізааталогіі.

Ў 2006 годзе пачаў падрыхтоўку спецыялістаў факультэт бухгалтарскага ўліку (дэканам пачынала працу к.э.н., дацэнт Карватоўская Л.В.). На ім склаліся кафедры бухгалтарскага ўліку, аналізу и аўдыту; фінансаў і аналізу ў АПК; гуманітарных навук.

З 2007 года прыйшлі першыя студэнты на інжынерна-тэхналагічны факультэт (першы дэкан д.т.н., прафесар Троцкая Т.П.), дзе падрыхтоўка спецыялістаў праводзіцца на кафедрах тэхналогіі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

захоўвання і перапрацоўкі расліннай сыравіны; тэхналогіі захоўвання і перапрацоўкі жывельнай сыравіўны; тэхнічнай механікі і хіміі; тэхнічнага забяспячэння вытворчасці і перапрацоўкі прадукцыі жывелагадоўлі .

Ў цяперашні час усе спецыяльнасці універсітэта можна падзяліць на тры групы. Да першай адносіцца - аграбіялагічны напрамак: аграномія, заатэхнія, абарона раслін і каранцін, аграхімія і глебазнаўства, ветэрынарная медыцына. Асноўнымі сферамі прафесійнай дзейнасці выпускнікоў з'яўляюцца прадпрыемствы і аб'яднанні, фірмы, канцэрны і холдынгі выраблюючыя, перапрацоўваючыя і гандлюючыя сельскагаспадарчай прадукцыяй; навукова-даследчыя ўстановы і вопытныя станцыі; вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы; арганізацыі, якія ажыццяўляюць праектаванне і ўладкаванне тэрыторый, нарыхтоўку і кантроль насеннага і пасадкавага матэрыялу; раённыя, абласныя і рэспубліканскія дзяржаўныя органы кіравання; прадстаўніцтвы замежных фірмаў па рэалізацыі сродкаў абароны раслін, кармавых дабавак і медыкаментаў.

Да другой групы ставіцца - эканамічны напрамак: эканоміка і арганізацыя вытворчасці ў галінах АПК, мэнэджмэнт; бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт; фінансы і крэдыт. Выпускнікі могуць працаваць на аграпрамысловых прадпрыемствах на пасадах эканамістаў і бухгалтараў, аўдытарскіх, рэвізійных і лізінгавых кампаніях, мытных органах, у аддзелах па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, банках, страхавых кампаніях.

І, нарэшце, тэхналагічны напрамак: тэхналогія захоўвання і перапрацоўкі харчовай раслінай сыравіны (спецыялізацыя: тэхналогія хлебапякарнай, макароннай, кандытарскай вытворчасці і харчовых канцэнтратаў); тэхналогія захоўвання і перапрацоўкі жывёльнай сыравіны (спецыялізацыі: тэхналогія мяса і мясных прадуктаў і тэхналогія малака і малочных прадуктаў). Асноўнымі сферамі дзейнасці для выпускнікоў могуць быць перапрацоўчыя прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу, спажывецкія грамадства, перапрацоўчыя цэхі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Атрымаць вышэйшую адукацыю ў універсітэце могуць таксама студэнты, якія скончылі каледжы, па скарочанай сістэме навучання. Акрамя дзённага навучання існуе завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі.

У ВНУ працуюць гурткі па інтарэсах, якія дазваляюць студэнтам дзённай формы навучання праводзіць мэтанакіравана свой вольны час. Ва ўніверсітэце створаны ўмовы для павышэння спартыўнага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

майстэрства. 43 студэнты выканалі нарматыў «Майстар спорту СССР», 5 - «Майстар спорту Рэспублікі Беларусь». Сярод выпускнікоў маюцца чэмпіёны свету, Еўропы, СССР, Рэспублікі Беларусь.

У тыя далекія гады ва універсітэце пачыналі працаваць Мелехін Г.П., Чарадкоў В.Н., Елісеяў І.Г., Аніська І.Л., Арлоў С.А., Вішнярэўскі Ф.Б., Коваль М.П., Васілюк Я.У., Паўленя В.П., Понізава Н.С., Бубен Д.М., Карпава Н.А., Баранаў Н.І., Цітова Е.М., Севярцаў М.С., Парамонава А. І., Кумакоў В.А., Блескіна М.А., Недарайшвілі Г.М., Чэтверыкоў В.М., Рымша П. І., Варыпаева Г. Г., Крэчка А.Ю., Винаградава Н.В., Моць І.С., Чарнышова М.М., Таўстова Н.Б., Амялішка М.В.; Недалугаў І.Ц., Козлоускі Я.Л, Лопаткін Г.П., Анцулевіч М.Г., Василеўскі П.В., Родзівонаў М.С., Грыгор'еў А.С, Селіна Н.А., Лозneў В.А., Шаставец І.С., Мацюк Ф.А.; Талдаяў В.С., Сопалеў Г.Б., Зубараў У.М., Кубышына Н.А., Казуля Е.С., Нелен Е.С., Юхно Ч.М., Александраў Ц.Ф., Таран М.А. і іншыя.

Такім чынам УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт" з'яўляецца "кузняй" кадраў для аграпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь!

ЛІТАРАТУРА

1. Гесць, Г.А. Гісторыя развіцця студэнцкай навукі на агранамічным факультэце /Г.А. Гесць //Тэзісы дакладаVII Міжнароднай студэнцскай навуковай канферэнцыі «Перспектывы развіцця вышэйшай адукацыі». –Гродна, 2006. – С. 102 – 105.
2. Электронны рэсурс, 2021 – Рэжым лоступа: https: www.ggau.by| / histjry. Дата доступа: 15.03.2021.

УДК 37.013.

## ОСОБЕННОСТИ ТРАНСФОРМАЦИИ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

**В. А. Дремук, Л. Л. Сотник**
УО «Барановичский государственный университет» (Республика Беларусь, 225404, г. Барановичи, ул. Войкова, 21; e-mail: barsu@brest.by)

Аннотация. Рассмотрены вопросы трансформации образования в условиях пандемии.
Ключевые слова: дистанционное обучение, виртуальная реальность.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ